ТЕЛЕПРОГРАММА НА НЕДЕЛЮ

№ 67 (1630)

Субота, 12 красавіка 2003 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах
Перыядычнасць — 5 разоў у тыдзень

Кошт свабодны.

Народная Воля

Надвор'е

Сёння ўдзень чакаецца: у Мінску — +3...+5, дождж, вечарам магчымы снег, уначы — 0...+2; у Брэсце — +6...+8, уначы — 0...+2; у Гродне — +3...+5, уначы — -1...+1; у Віцебску — +4...+6, уначы — +1...+3; у Гомелі — +6...+8, уначы — +2...+4; у Магілёве — +6...+8, уначы — +1...+3.

На ўсёй тэрыторыі краіны ўдзень дождж, уначы — без ападкаў. Вецер паўднёва-заходні, 4—7 м/с. У наступныя двое сутак па Мінску чакаецца: удзень +4...+6, уначы +2...+4, без ападкаў. Вецер заходні, 1—3 м/с.

www.meteo.by

ПУЛЬС

Васіль Быкаў выпісаны з клінікі ў Празе

9 красавіка народны пісьменнік Беларусі Васіль Быкаў выпісаны з клінікі ў Празе, дзе 27 сакавіка яму зрабілі складаную аперацыю на страўніку.

Як паведаміў БелаПАН рэдактар Беларускай службы Радыё "Свабода" Сяргей Навумчык, "зараз пісьменнік адчувае сябе добра, улічваючы яго 79-гадовы ўзрост і хірургічнае ўмяшанне пад агульным наркозам".

"Выпіска адбылася крыху пазней запланаванай даты, аднак у гэтай сітуацыі лепш падстрахавацца, чым спяшацца, — сказаў Навумчык. — Урачы лічаць, што стан здароўя Васіля Уладзіміравіча дазваляе яму праходзіць рэабілітацыю дома. Пакуль невядома, наколькі доўгім будзе перыяд аднаўлення. У маі пісьменнік запрошаны ў Францыю для ўдзелу ў вялікай праграме Дзён беларускай культуры, арганізаваных Віржбініяй Шыманец, пляменніцай старшыні Рады Беларускай Народнай Рэспублікі Івонкі Сурвілла".

Марат ГАРАВЫ.

Шклоў — сталіца газетнай паперы

Пляцоўкай для будаўніцтва ў Беларусі завода па вытворчасці газетнай паперы, верагодней за ўсё, стане Шклоў.

Разам з выбарам пляцоўкі для будаўніцтва завода працягваецца работа па падрыхтоўцы праекта і пошуку патэнцыяльных інвестараў. Паводле інфармацыі Мінэканомікі, у канцы сакавіка ў Гамбургу (ФРГ) адбыліся перамовы паміж канцэрнам "Белляспаперпрам" і фірмай "Конрад Якабсан Групе". Нямецкі бок прапанаваў "як найбольш эканамічна эфектыўны" варыянт будаўніцтва завода магутнасцю 200 тысяч тон паперы ў год з выкарыстаннем сучаснага высокапрадукцыйнага абсталявання.

Улічваючы, што ёмістасць айчыннага рынку на сённяшні дзень складае каля 40 тысяч тон газетнай паперы ў год, а ў перспектыве ўзрасце да 70 тысяч тон, інвестыцыйны праект, што прапаноўваецца, варта разглядаць як экспартаарыентаваны.

Ірына САЗАНОВІЧ.

Паслы Германіі і Францыі наведалі ў калоніі Юрыя Бандажэўскага

Пасол Германіі Хельмут Фрык і пасол Францыі Стэфан Шмялеўскі наведалі 9 красавіка прафесара Юрыя Бандажэўскага, які адбывае пакаранне ў калоніі УЖ-15/1, размешчанай у Мінску на вуліцы Кальварыйскай.

Як паведамляе пасольства ФРГ, наведванне, якое доўжылася каля гадзіны, адбылося па просьбе Савета міністраў Еўрапейскага Саюза. Прафесар Бандажэўскі, зазначаецца ў паведамленні пасольства, выказаў падзяку за наведванне, а таксама за пастаянную ўвагу, якую надаюць яго справе ўрады і насельніцтва краін — членаў ЕС.

Нагадаем, што былы рэктар Гомельскага дзяржаўнага медінстытута, прафесар медыцыны Юрый Бандажэўскі адбывае пакаранне па рашэнні суда, які прызнаў яго вінаватым у атрыманні хабару і прыгаварыў да васьмі гадоў пазбаўлення волі ў калоніі ўзмоцненага рэжыму.

Пасля наведвання Бандажэўскага паслы накіравалі ў органы ЕС даклад аб сваім візіце, паведамляе нямецкая дыпмісія.

Вольга ЛАПІКАВА.

ТЕМА ДНЯ

Нервная реакция

Белорусский МИД считает любопытство американцев попыткой «оказать давление на Беларусь за независимую внутреннюю и внешнюю политику»

Мировые агентства, в том числе российские, всю уходящую неделю передавали информацию о том, что Конгресс США в ближайшее время рассмотрит документ, который имеет не новое для нас название — "Акт о демократии в Беларуси".

В этом документе, как пишет российская "Независимая газета", кроме всего прочего будет *"обнародована информация о личных сбережениях А.Лукашенко и фактах незаконной торговли белорусским оружием"*. В конце прошлого года практически все государственные СМИ энергично "прошлись" по этому законопроекту Конгресса, замусолив только один пункт, касающийся помощи белорусской оппозиции в размере 40 миллионов долларов, якобы выделяемой из бюджета США.

В настоящее время "Акт о демократии в Беларуси" рассматривается обеими палатами Конгресса и в ближайшие месяцы, как сообщается, может быть подписан президентом США Джорджем Бушем.

Не оригинален в своей реакции на скандальный законопроект пресс-секретарь МИД Беларуси Андрей Савиных, который, отвечая на вопрос НТВ, фактически подтвердил факт обсуждения за океаном болезненного для белорусских властей документа: *"По мнению МИД, законопроект по Беларуси, который рассматривается в Конгрессе США, имеет ярко выраженный деструктивный характер, не будет способствовать развитию белорусско-американских отношений, более того, отбросит их назад. Мы рассматриваем законопроект как намерение оказать давление на Беларусь за ее независимую внутреннюю и внешнюю политику, как неуместное манипулирование правозащитной тематикой, как попытку взять реванш за поражение делегации Конгресса США в ходе решения вопроса о восстановлении членства Беларуси в ПА ОБСЕ. Необходимо также отметить, что односторонние меры в отношении суверенных государств — весьма сомнительная практика с точки зрения международного права"*.

Где-то мы эту риторику уже слышали. По-моему, из уст бывших иракских чиновников. Накануне их падения...

Самое удивительное в этой истории то, что карманом нашего мудрейшего из мудрейших заинтересовался законодательный орган страны, находящейся от Минска на расстоянии в многие тысячи километров. Доходы высшего белорусского чиновника абсолютно не волнуют ни нашу Палату представителей, ни наш Конституционный суд. Дотируемые государством СМИ озабочены, похоже, исключительно восстановлением в Беларуси советской идеологии, ленинскими субботниками и запуском национального космического спутника.

А почему, собственно, знать доходы первого лица страны противоестественно или, как утверждает г-н Савиных, является *"неуместным манипулированием правозащитной тематикой"*? Оно, первое лицо, народом, условно говоря, нанято, чтобы отвечать за все свои доходы и расходы. Разве это не естественно?

Гневно критикуемые нашими государственными газетами Соединенные Штаты, кстати, имеют в своей истории много случаев немедленной отставки государственных служащих по причине ОДНОГО-ЕДИНСТВЕННОГО финансового скандала. Экскурсия в карман, организованная независимыми американскими СМИ, приводила такого чиновника, как правило, к НЕМИНУЕМОМУ и НЕМЕДЛЕННОМУ краху.

Впрочем, пресс-секретарь МИД А.Савиных не свои слова выразил. Он лишь озвучил то, что ему написали.

Александр СИЛИЧ.

НЕЗАВИСИМАЯ ЭКСПЕРТИЗА

Блеск дворцов и нищета стариков

Борис ЖЕЛИБА, профессор, доктор экономических наук

Печальны итоги развития экономики. Так, при общем снижении инфляции в прошлом году по сравнению с предыдущим она оставалась достаточно высокой: на потребительском рынке цены выросли на 34,8%, на рынке цен производителей промышленной продукции — на 42,7%. Но эти показатели обобщающие, интереснее более конкретные данные.

Например, если цены на молочные продукты выросли на 21,9%, на мясо и мясопродукты — на 17,1%, то на картофель цены увеличились на 72,6%, овощи — на 49,7%, масло животное — на 40,8%. Несколько ниже были темпы роста цен на непродовольственные товары. Холодильники подорожали на 15,4%, телевизоры — на 12,8%, медикаменты — на 27,8%, бензин — на 41,1%. Белорусов, видавших еще не так давно рост цен в 2—3 раза, такие цифры в целом не пугают.

Пугает другое — многократный рост цен на услуги. Тарифы на оплату электроснабжения возросли за прошедший год в 2,5 раза, водоснабжения — в 2,3 раза, газоснабжения — в 3,2 раза, отопления — в 2,8 раза. А в целом тарифы на услуги жилищно-коммунального хозяйства поднялись в 2,9 раза. Вместо запланированной на текущий год 50%-ной оплаты населением себестоимости этих услуг уже в I квартале вышли на 60%.

Самое печальное, что такие темпы роста никак не подкреплялись соответствующим ростом зарплат и особенно пенсий. Ликвидация так называемого перекрестного субсидирования услуг ЖКХ подобным образом просто разорительна для малооплачиваемых слоев населения и должна быть приостановлена.

К декабрю 2002 г. среднемесячная зарплата работников страны составила, согласно официальным данным, 220,9 тыс. рублей. В промышленности — 250,1 тыс. руб., на транспорте — 264,9 тыс. руб., в строительстве — 274,6, в торговле и общепите — 176,7, в здравоохранении — 202,1, в сфере образования — 185,2, культуры — 171,1 тыс. рублей. Как видим, в социально-культурной области средняя зарплата как не достигала уровня оплаты труда в промышленности, что было давно законодательно закреплено, так и не достигает сегодня. В сельском хозяйстве среднемесячная зарплата составила всего 113,9 тыс. рублей. Наиболее высокооплачиваемыми остаются работники банковской системы: 457,6 тыс. рублей. Чтобы удержать зарплату на этом уровне, большинство банков провели крупные сокращения своих служащих. Их доходы почти не растут по причине тяжелого финансового положения клиентов.

К сегодняшнему дню средняя зарплата рабочих и служащих Беларуси оценивается в эквиваленте 120 долларов США. Должна была быть по прогнозам 150 долларов. Достичь этого рубежа в обозримом будущем невозможно из-за кризисного состояния финансов предприятий и падающей эффективности производства. В течение года в ряде отраслей, особенно в сельском хозяйстве, имела место существенная задолженность по заработной плате.


Крайне низкими в прошлом году оставались размеры пенсий. Они практически были неизменными на протяжении февраля-октября. В ноябре средний размер назначенной месячной пенсии составил 89,8 тыс. руб., или 74% от минимального потребительского бюджета пенсионера, который и без того самый скромный. Реальный размер пенсии в течение 2001 года повышался только в феврале и ноябре. В остальные 10 месяцев он снижался. Если пенсионер проживает один, то после оплаты услуг ЖКХ ему ничего не остается на жизнь. Взгляните теперь на приведенные выше темпы роста и уровни цен с позиций доходов пенсионеров. Как им это осилить? В России правительство все же старается изыскивать дополнительные ресурсы на поддержание пенсионеров. Наши — остаются одни, лицом к лицу со своими финансовыми проблемами.

Общеизвестно, наполняемость Фонда социальной защиты населения неудовлетворительная, опять-таки из-за тяжелого финансового состояния предприятий. Для оздоровления финансовой ситуации целесообразно, если нужно, внести соответствующие изменения в законодательство, с тем чтобы расширить финансовую базу пенсионного обеспечения.

Пока же мы видим: лучший в Европе железнодорожный вокзал-дворец, отстроенные паркинги, ледовые дворцы, футбольный манеж, в проекте — элитный подземный торговый центр на площади Независимости и т.д. Эта "лакировка" фасада набила оскомину. В итоге и получается: блеск дворцов и нищета стариков...

ВОЙНА В ИРАКЕ

Армия Хусейна капитулирует



Войска Саддама Хусейна ушли из крупнейшего на севере города Мосул, сообщил представитель командования курдскими войсками в Ираке. По некоторым данным, многие иракские военные дезертировали, бросив оружие и технику. По сообщению британского телеканала "Скай Ньюс", курдские партизаны и американские солдаты вошли в город, не встретив никакого сопротивления. Оставшиеся в Мосуле представители иракской военной администрации начали переговоры о капитуляции и потребовали амнистии.

Войска иракской Республиканской гвардии все еще занимают окрестности Мосула. Кроме того, иракцы продолжают удерживать город Тикрит, родину Саддама Хусейна. Обнаруженные там подразделения иракских войск бомбит американская авиация.

Временное правительство Ирака, которое возглавит генерал армии США в отставке Джей Гарнер, начнет работу после конференции, темой которой будет политическое будущее страны. Изначально проведение встречи, куда США пригласили 40 иракских политиков из оппозиции как внутри страны, так и за ее пределами, намечено на следующей неделе в городе Насирия. Возможно перенесение даты конференции на несколько дней по соображениям безопасности участников.

Лидер крупнейшей оппозиционной иракской организации "Верховный совет исламской революции в Ираке" Мохаммед Бакир аль-Хаким уже заявил, что будет бойкотировать встречу в Насирии из-за присутствия американцев в городе. Представитель Совета сообщил, что его члены не будут работать в правительстве, возглавляемом американцем, и никогда не станут частью планов США. Источники в оппозиции обнародовали имена некоторых уже назначенных министров. Работой Министерства внутренних дел будет руководить бригадный генерал, генеральный секретарь иракской национальной коалиции (ИНК) Тауфик аль Ясери, возглавлявший в 1991 году восстание против Саддама Хусейна. Всего представителям ИНК отойдет 16 мест в новом правительстве.

Министром обороны нового Ирака станет генерал Абдель Эмир аль Сабах, министром информации — Мохаммед аль Джаббар. Министром труда и строительства станет Адель аль Шейхали. Источники в оппозиции также сообщили, что в списке назначений отсутствует имя Ахмеда аль Чалаби, лидера ИНК, имеющего сильную поддержку Пентагона. Ранее аль Чалаби обвинил США в небрежном отношении к безопасности мирного населения на юге Ирака.

Наталья ГАК.
Фото Рейтер.

У модзе — міні

У летняй модзе 2003 года будуць панаваць тэндэнцыі стыляў 60-х і 80-х гадоў мінулага стагоддзя. Такім прагнозам беларускі дызайнер Вольга Самошчанка падзялілася з удзельнікамі прэс-канферэнцыі ў Мінску.

Папулярным па-ранейшаму застануцца яркія, насычаныя колеры, рознакаляровыя тканіны, актуальным застанецца і белы колер. Як зазначыла Самошчанка, гэтым летам у моду зноў увойдуць міні-спадніцы, адзенне з махрамі і мноствам накладных кішэняў.

Вольга ЛАПІКАВА.

Ні капейкі!

10 красавіка Віцебскі гарвыканкам зацвердзіў план мерапрыемстваў па падрыхтоўцы горада да правядзення XII Міжнароднага фестывалю мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску" ў 2003 годзе. Як паведаміў на пасяджэнні гарвыканкама яго старшыня Уладзімір Пелагейка, "адкрытым застаецца пытанне фінансавання гэтых мерапрыемстваў", а пакуль на іх рэалізацыю "не выдзелена ніводнай капейкі".

Сяргей КОЧАТАЎ.

Народная Грамада пачынае рыхтавацца да парламенцкіх выбараў

Хаця да выбараў у Палату прадстаўнікоў, згодна з дзеючай цяпер Канстытуцыяй, застаецца яшчэ 1,5 года, Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Народная Грамада), палічыла мэтазгодным ужо пачынаць адпаведную кампанію.

Мікола Статкевіч — кіраўнік партыі — гаворыць, што так рана падрыхтоўку яшчэ ніколі не пачыналі: "Але наш вопыт сведчыць, што найбольшы поспех у нас быў там (нашы кандыдаты выходзілі ў другі тур, было бачна, што ідзе нармальнае галасаванне), дзе была вялікая папярэдняя праца: ад канцэртаў, спартыўных свят, распаўсюджвання ўлётак... У такіх гарадах партыя не сустракала да сябе негатыўнага стаўлення. А вось там, дзе гэтай працы не было (у нас ёсць і такія гарады, напрыклад, Бабруйск) там, на жаль, такія факты адзначаліся".

Кіраўнік БСДП (НГ) адзначыў, што на новых выбарах партыйная стратэгія ў параўнанні з мясцовымі застанецца нязменнай. Яна заснавана на стварэнні пазітыўнага іміджу партыі, яе рэгіянальных арганізацый і будучых кандыдатаў у дэпутаты. А вось тактыка зменіцца, паколькі ў Палату прадстаўнікоў будуць абірацца толькі 110 дэпутатаў.

— Акруг, у адрозненне ад мясцовых выбараў, будзе мала. І папярэдняя наша тактыка, прасачыцца дзесьці ў сярэдніх гарадах, ужо не спрацуе. Усе 110 акруг будуць кантралявацца ўладамі. І тут, на мой погляд, магчыма толькі лабавое супрацьстаянне. У першую чаргу ў сталіцы і іншых буйных гарадах, — гаворыць Мікола Статкевіч.

Я спытаў кіраўніка Народнай Грамады, што будзе рабіць партыя ў вёсцы. Спытаў невыпадкова, паколькі той жа Мікола Статкевіч казаў, што на мясцовых выбарах партыя недаацаніла пратэстны настрой сялян. Аднак гэтым разам партыйны лідэр не мае вялікіх ілюзій: "Там акругі былі невялікія, і таму пэўны шанец тады быў. На парламенцкіх выбарах адна акруга будзе аб'ядноўваць аж тры сельскія раёны. І тут, на жаль, спрацуе бяспраўе селяніна перад мясцовым начальствам. Але ўсё роўна мы будзем тут вылучаць сваіх кандыдатаў. Можа, нават не столькі дзеля таго каб яны трапілі ў Палату прадстаўнікоў, колькі дзеля таго, каб добра падрыхтавацца да прэзідэнцкай кампаніі".

Мікола Статкевіч гаворыць, што ў вёсках магчымасці для фальсіфікацыі неабмежаваныя. Нават на мясцовых выбарах былі выпадкі, калі не толькі з урнамі хадзілі па хатах, з чым ужо як бы і звыкліся, а проста давалі людзям распісацца за бюлетэнь. А сам бюлетэнь у рукі селяніну не давалі.

Лідэр БСДП (НГ) разам з тым лічыць, што апазіцыі па сілах узяць пад кантроль усе 110 акруг. Для гэтага патрэбна стварыць агульнадэмакратычную кааліцыю. Сацыял-дэмакраты лічаць, што лепшы час для яе арганізацыі — сёлетняя восень.

Уладзімір ГЛОД.

КОНФЛИКТ

«Не хочу вступать в БСМ!»

После уроков один из учеников десятого класса столичной школы №41 пришел домой и сказал: *"Мама, я тебя огорчу: нас заставляют вступать в Белорусский союз молодежи. Если откажемся — обещают большие неприятности при поступлении в вуз. Наверное, я буду вынужден поступиться своими принципами и все-таки пойти в БСМ..."*.

"Честно говоря, мы даже не знаем, что делать, — говорит растерянная мама *(фамилия матери и сына есть в редакции, не называю их по понятным причинам. —* **М.К.**). — В прошлом году было то же самое, однако нам удалось отстоять свои права. Многие ученики написали заявление о том, что они против вступления в Белорусский союз молодежи, и никто больше не настаивал. Хотя, справедливости ради, стоит отметить, что в минувшем году 7 человек из нашей школы все же стали членами БСМ".

Многие учащиеся десятых классов в столичной школе №41 сегодня категорически не хотят быть членами такой организации, как БСМ. Однако одна учительница (между прочим — белорусского языка) сказала детям, что в школу якобы пришла соответствующая разнарядка, согласно которой надо собрать определенное количество заявлений от учеников, желающих вступить в БСМ.

"Нам сказали, что если не напишем заявления, то в следующем году никуда не поступим, — рассказывает ученик СШ №41. — И если в анкете на вопрос "Членом какой партии являетесь?" напишем "беспартийный", то шансы попасть в университет или институт значительно уменьшатся, поскольку предпочтение будут отдавать членам БСМ, несмотря, наверное, даже на результаты экзаменов.

Сказали, что фотографии пока можно не нести, а заявление и деньги на удостоверение (чуть больше тысячи) — обязательно. Иначе будут большие неприятности и у директора школы, и у классного руководителя, и у нас.

С одной стороны, не хочется подводить педагогов, а с другой — поступаться собственными принципами и убеждениями...".

В Министерстве образования, куда "Народная воля" обратилась с просьбой прокомментировать ситуацию, сделали вид, что удивлены описанной ситуацией.

Исполняющая обязанности директора Департамента по делам молодежи при Министерстве образования Республики Беларусь **Марина Ежова** сказала, что *"никаких инструкций, распоряжений, команд, приказов или графиков наш Департамент в школы не спускал. Департамент по делам молодежи никого таким образом не запугивает. У нас даже мысли такой не было! А кто запугивает — надо выяснить"*.

Марина Юрьевна записала номер школы и пообещала разобраться, заметив, что все это — *"просто дискредитация организации"*, которая, на ее взгляд, *"может нормально и убедительно работать с детьми"*.

Директор школы №41 **Валентина Понтус** говорит, что первый секретарь райкома БСМ действительно приходил в школу, разговаривал с учениками. *"Однако, насколько мне известно, в школе в Белорусский союз молодежи вступают только желающие. Например, у меня десятый физико-математический класс не захотел вступать, и никто их не заставляет"*.



Школьники с пионерским салютом проходят мимо правительственных трибун во время парада 3 июля в Минске.

Фото IREX/ProMedia.

Узнав фамилию учительницы, которая проводила с детьми беседы на общественно-политические темы, Валентина Викентьевна пообещала разобраться.

Несколько позже, со слов Валентины Понтус, выяснилось, что учительница белорусского языка говорила ученикам о том, что *"все молодежные организации поддерживают политику нашего государства и политику президента Республики Беларусь. И что в подобные организации всегда вступала передовая часть молодежи..."*.

"Я гарантирую, что ни одного ученика из нашей школы, не желающего вступать в Белорусский союз молодежи или в какие-то другие организации, никто насильно туда тянуть не будет, — убежденно сказала Валентина Викентьевна. — ***Никаких гонений и наказаний! Заявляю об этом совершенно официально. У всех есть право выбора"*.**

Руководитель Белорусской ассоциации молодых политиков **Александр Цынкевич** говорит, что описанный случай — далеко не единственный. "У меня есть подобная информация из разных уголков Беларуси, — говорит Александр. — Запугивают людей, и они якобы по доброй воле пишут заявления о вступлении в ряды БСМ...

Безусловно, такие методы рейтинга БСМ не добавляют. Однако эта организация изначально была обречена на недолгую жизнь, поскольку создана административным путем. Реальных мероприятий по работе с молодежью они не проводят. На мой взгляд, лидеры государственных молодежных организаций сегодня просто зарабатывают себе дивиденды, в том числе и материальные. Например, Белорусский патриотический союз молодежи в свое время якобы успешно реализовывал программу по строительству жилья для молодежи. Однако это жилье получали, как правило, лишь избранные: либо особо преданные, либо особо приближенные...

Молодые люди это прекрасно понимают и по доброй воле в подобные структуры вряд ли пойдут, поскольку большинство из них не поддерживает курс нынешней власти".

Комментарий пессимиста

Александра БАТУРИНА, бывший учитель:

— В начале 90-х годов, когда проходили первые альтернативные выборы, директор школы, в которой я работала, вызвала несколько учителей и объявила, что мы будем группой поддержки кандидата от коммунистической партии. На вопрос: "А если мы не поддерживаем этого кандидата и собираемся голосовать за другого?" — последовал очень спокойный и уверенный ответ: "Вы не имеете на это права. Вы — идеологические работники...".

После недавнего идеологического совещания идеология опять перестала быть тем, что руками не пощупаешь, на зуб не попробуешь. Идеологический босс районной администрации надавит на заведующего отделом образования, тот — на директора школы, директор — на учителя, учитель — на родителей... И каждый будет кивать на нижестоящего: мол, перегиб на местах. Кроме того, как это было в советские времена, будут додавливать детей поодиночке, воздействовать на родителей через место работы. В конце концов, если не сработает аргумент "не поступит в вуз", сработает страх потерять работу, ведь родителям надо не только дать образование ребенку, но и элементарно накормить его (а это касается и партийного босса, и директора школы).

Проблема еще и в том, что, пока таких протестующих много, их уважают. Но когда они становятся идейными одиночками, к ним начинают относиться как к малохольным.

Сегодня родители стоят перед страшной дилеммой: поддерживать и развивать в ребенке собственное мнение — значит, противопоставлять его идеологической машине. Воспитывать в нем конформиста — противопоставлять его себе...

Марина КОКТЫШ.

ГЭТА БЫЛО ТАК...

Крывавая ноч

У ноч з 11 на 12 красавіка 1995 года малпападобныя бандыты жорстка расправіліся з дэпутатамі-патрыётамі

Лявон БАРШЧЭЎСКІ, дэпутат Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь 12-га склікання (1990—1996 гг.)

Пачну з перадгісторыі. Многія чытачы "Народнай волі", бадай, памятаюць тое выступленне на сесіі Вярхоўнага Савета дэпутата-рабочага Сяргея Антончыка. Быццам бомба ўзарвалася ў Авальнай зале Дома ўрада. Прыводзячы канкрэтныя факты, ён паказаў, што пасля першых беларускіх прэзідэнцкіх выбараў улада не памянялася: да яе рычагоў атрымала доступ групоўка ранейшых "непатапляльных". Тых самых, што прывыклі свае асабістыя інтарэсы выдаваць за інтарэсы народа і дзяржавы, а жыццё канкрэтнага чалавека трактаваць як вялікую ласку, падораную яму ўладай.

Сяргей Антончык разварушыў страшэнны вулей. І ён наіўна верыў, што людзі яго зразумеюць і стануць на ягоны бок. Улада ж адразу паказала: нічога *зразумець* людзям яна *не дасць*. І як вынік — ужо ў снежні 1994 года, літаральна праз некалькі тыдняў, з'явіліся "белыя плямы" ў газетах, а ў сакавіку 1995-га гвалтоўным чынам быў адхілены ад пасады галоўнага рэдактара "Народнай газеты" дэпутат Вярхоўнага Савета Іосіф Сярэдзіч.

Потым былі, узгадайма: недапушчэнне да працы новага законна прызначанага парламентам рэдактара "Народнай газеты", закрыццё радыёстанцыяў і газет, што выказвалі альтэрнатыўныя ўладным думкі, яшчэ пазней адзін журналіст бясследна знік, рэдактары і журналісты недзяржаўных выданняў сталі трапляць на "хімію" і... можна толькі здагадвацца, з чым незалежныя СМІ могуць сутыкнуцца далей.

Самай, аднак, вялікай косткай у горле апекуноў і дарадцаў улады была беларуская дзяржаўнасць — як у гістарычным плане, гэтак і ў сучасным. Беларуская мова, нацыянальныя сімвалы (бел-чырвона-белы сцяг і "Пагоня") вельмі хутка маглі стацца пазнавальнымі знакамі гэтай дзяржаўнасці не толькі ў досыць вузкім інтэлігенцкім коле, але і ў шырокіх масах. Гэта ніяк не ўваходзіла ў планы імперцаў у суседняй дзяржаве і тых, хто шукаў іхняй апекі ў Беларусі. Бо немагчыма знішчыць дзяржаўніцкія настроі ў думаючай частцы народа, які прайшоў паўнавартасны працэс нацыянальнай самаідэнтыфікацыі. Ударыць па мове і нацыянальных сімвалах было найпрасцей, бо вынішчаліся і душыліся яны стагоддзямі, а новае адраджэнне было пяцігадовым дзіцём.

Вось тут і трэба шукаць карані падзей, якія адбыліся ноччу з 11 на 12 красавіка 1995 года. Нагадаю, што ў канцы сакавіка таго года прэзідэнт А.Лукашэнка ўпершыню абвясціў пра свой намер правесці рэферэндум па пытаннях фактычнай ліквідацыі дзяржаўнасці беларускай мовы, вяртання дзяржаўнай сімволікі савецкага ўзору. падтрымкі яго заяў аб эканамічнай інтэграцыі з Расіяй і атрымання ім права аднаасобна распускаць Вярхоўны Савет. Неўзабаве ў прэсе з'явілася заява досыць вялікай групы дэпутатаў, у якой яны прасілі прэзідэнта з'ініцыяваць рэферэндум па пытанні надання рускай мове статусу дзяржаўнай і змены дзяржаўнай сімволікі.

Асабіста я размаўляў са шмат якімі падпісантамі той заявы. Высветлілася цікавая рэч: прыкладна палова з іх гаварыла, што яны за беларускую мову як адзіную дзяржаўную, але супраць сімволікі, якая ім здавалася то "літоўскай", то "фашысцкай"; другая ж палова сцвярджала, што, наадварот, не мае нічога супраць несавецкай сімволікі, але баіцца абавязковага характару беларускай дзяржаўнай мовы.

У вышэйзгаданай заяве, аднак, усё было звaленае ў адну кучу: адных проста "прыплюсавалі" да другіх. Ініцыяванне рэферэндуму самае меншае па двух пытаннях было антыканстытуцыйным: згодна з Канстытуцыяй, рэферэндумы, якія мелі б на мэце вырашэнне канстытуцыйных пытанняў, не могуць праводзіцца ў апошнія шэсць месяцаў паўнамоцтваў дзейнага Вярхоўнага Савета. Пытанні змены статусу дзяржаўнай мовы і вызначэння таго, хто мае права распускаць парламент, адназначна патрабавалі змен у Канстытуцыі.

Выбары ж у новы Вярхоўны Савет былі прызначаныя на 14 мая таго ж года — гэта значыць заставалася менш як два месяцы пасля першых вусных выказванняў прэзідэнта пра неабходнасць рэферэндуму. Вынясенне першага з названых вышэй пытанняў на рэферэндум, акрамя таго, выразна супярэчыла артыкулу 3 дзейнага тады "Закона аб народным волевыяўленні (рэферэндуме) у Рэспубліцы Беларусь".

Аднак ужо тады было зразумела, што парушэнне Канстытуцыі не магло спыніць тых, хто праектаваў рэферэндум: падобна, што для кагосьці з іх гэта была канстытуцыя чужой ім дзяржавы. На жаль, на бок парушальнікаў Канстытуцыі тады выразна стала фракцыя ПКБ у Вярхоўным Савеце. Мяркую, што паважаны Сяргей Калякін пазней усё-такі пашкадаваў (калі, вядома, не забыўся) пра тое, што яго партыя яшчэ ў 1995 годзе, мякка кажучы, заплюшчыла вочы на відавочнае ламанне дзяржаўнага права.

10—11 красавіка 1995 года пытанне аб разглядзе ініцыятывы прэзідэнта А.Лукашэнкі наконт правядзення рэферэндуму 14 мая было вынесена на чарговае пасяджэнне Вярхоўнага Савета 12-га склікання — сесіі, што планавалася як самая апошняя. У першы дзень дэбатаў я, з прычыны хваробы (высокая тэмпература), удзел у дэбатах прыняць так і не змог і сачыў за падзеямі па прамой, якая вялася з пасяджэння парламента, радыётрансляцыі (апошні пакуль што ўсплёск нябачанай цяпер дэмакратыі!).

Назаўтра раніцай, наглытаўшыся аспірыну і вітамінаў, я ўсё-такі паехаў у Вярхоўны Савет і зайшоў у залу пасяджэнняў якраз у тую хвіліну, калі лідэр фракцыі БНФ Зянон Пазьняк з трыбуны заклікаў прысутных абвясціць галадоўку ў знак пратэсту супраць запланаванага відавочнага парушэння Канстытуцыі. Можна сказаць, не паспеў я заняць сваё месца ў парламенцкай ложы, як адразу давялося скіравацца да трыбуны, дзе побач са мной галадоўку распачалі яшчэ 18 дэпутатаў з фракцый БНФ і Сацыял-дэмакратычнай Грамады. Сярод галадоўцаў былі людзі розных прафесіяў і ўзростаў: ад 34-гадовых журналістаў Сяргея Навумчыка і Ігара Герменчука (якога, на жаль, сёння ўжо з намі няма) да філолага і дыпламата Пятра Садоўскага, інжынераў Уладзіміра Заблоцкага і Мікалая Крыжаноўскага, якім на той час ужо даўно пераваліла за 50.

Пачатак галадоўкі быў нечаканым не толькі асабіста для мяне, але і для парламенцкай большасці: шмат хто з дэпутатаў схамянуўся, узгадаў, што каму, як не ім, трэба бараніць нядаўна (і не без праблем) прынятую Канстытуцыю, за якую, дарэчы, тады так горача агітаваў дэпутат Лукашэнка.

Выступ кіраўніка камісіі Вярхоўнага Савета па заканадаўстве Дзмітрыя Булахава (які падчас прэзідэнцкіх выбараў актыўна працаваў у камандзе будучага прэзідэнта) расставіў неабходныя акцэнты. У выніку ніводнае з пытанняў, вынесеных прэзідэнтам, — акрамя невыразна сфармуляванага пытання пра падтрымку захадаў прэзідэнта дзеля эканамічнай інтэграцыі з Расіяй, — не было зацверджанае большасцю парламента!

Спікеру Мечаславу Грыбу трэба было паставіць на галасаванне пытанне аб завяршэнні дэбатаў па гэтым пытанні і прапанаваць перайсці да наступнага пытання парадку дня. Аднак Аляксандр Лукашэнка пачаў усялякімі спосабамі ціснуць на парламенцкую большасць, якая, трэба зазначыць, знаходзілася ў падважаным стане: ніхто не быў упэўнены ў сваёй будучыні пасля маючых адбыцца выбараў 14 мая. Таму пагроза паўторнага вынясення на разгляд ініцыятывы аб рэферэндуме заставалася абсалютна рэальнай, і намі калектыўна было вырашана: галадоўку не спыняць.

Пасля заканчэння сесіі ў 18 гадзін мы засталіся ў зале пасяджэнняў. Побач з намі напачатку было некалькі журналістаў з розных выданняў. Потым яны па чарзе загадкавым чынам пачалі знікаць. Пасля 21 гадзіны каля тэлефона ў "бакоўцы" залы пасяджэнняў заставалася толькі карэспандэнтка Радыё "Свабода" Алена Радкевіч. Але каля 23 гадзін да яе падышло некалькі невядомых асоб у цывільным, якія вывелі Алену з залы.

Ужо ў той момант стала зразумела, што, хутчэй за ўсё, застацца ў зале нават да наступнай раніцы нам ужо не дадуць. Перш чым тэлефон у "бакоўцы" быў адключаны, нам яшчэ ўдалося перадаць журналістам адпаведную інфармацыю і папрасіць іх не адыходзіць ад будынка Дома ўрада. На жаль, як выявілася пазней, недзе пасля 0 гадзін 12 красавіка яны ўсе разышліся па дамах. Шлях да ўжывання грубай сілы быў, гэткім чынам, фактычна адкрыты.

Каля паўночы ў залу ўвайшла група асоб у чорных скураных куртках на чале з тагачасным кіраўніком службы аховы прэзідэнта, былым дэпутатам Міхаілам Цесаўцом. Апошні абвясціў, што паступіў сігнал, нібыта ў будынку закладзеная бомба, і таму ўсе з будынка павінны быць эвакуяваныя. Цікава, што хвілін за дваццаць да гэтага мы ў зале якраз абмяркоўвалі сцэнарый нашага выдалення з Дома ўрада і гаварылі пра тое, што тут будуць шукаць "бомбу". Таму выступ Цесаўца не быў для нас нечаканым, і мы прапанавалі яму прывесці сапёраў і пры нас агледзець усё, што яны толькі захочуць. Цесавец, ведаючы, што ніякай бомбы ў будынку няма, аддаў загад сваім падначаленым выводзіць нас з залы, але мы ўсе дружна выцягнулі з кішэняў свае дэпутацкія пасведчанні, выразна папярэдзілі людзей у скуранках, што за парушэнне недатыкальнасці дэпутатаў кожны з іх персанальна будзе несці адказнасць — аж да крымінальнай. І, о дзіва! Падначаленыя адмовіліся выконваць загад свайго шэфа.

Цікава, што калі праз некалькі хвілін хтосьці з калег выйшаў у фае залы, ён праз вокны ўбачыў, што ў некалькіх памяшканнях і правага, і левага крылаў будынка гарэла святло, а каля правага пад'езду стаяла "іншамарка", над радыятарам якой развяваўся сцяжок (яшчэ бел-чырвона-белы!). Значыць, тут былі розныя людзі, у тым ліку высокія кіраўнікі, якія не баяліся аніякіх бомбаў!

Зрэшты, сапёры з'явіліся і, натуральна, нічога не знайшлі, пра што і склалі адпаведны акт. Наступныя паўгадзіны былі адносна спакойныя, і мы дамовіліся, што можам прылегчы адпачыць тут жа каля цэнтральнай трыбуны залы пасяджэнняў (балазе падлога была засцеленая лямцавым паласам); пры гэтым адзін чалавек (па чарзе) будзе дзяжурыць і ў выпадку чаго ўсіх пабудзіць.

Я адчуў, што ў мяне зноў паднялася тэмпература і, накрыўшыся зімовай курткай, лёг падрамаць злева ад галоўнай трыбуны. Каля трэцяй гадзіны мяне і іншых абудзіў рэзкі крык дэпутата Валянціна Голубева, які перад гэтым прыадчыніў дзверы ў фае: *"Ваенныя з аўтаматамі і ў масках!"*. Мы хутка паўскоквалі і расселіся ў ложы, дзе звычайна сядзелі члены Прэзідыума Вярхоўнага Савета. Валянцін сказаў нам, што ў фае, выстраіўшыся некалькімі шарэнгамі, стаяць вайскоўцы ў форме, узброенні, у масках з адгазнікамі: агулам "чалавек пяцьсот альбо шэсцьсот". На балконах залы пасяджэнняў зноў з'явіліся людзі з відэакамерамі (як мінімум двое). Тут ужо ні ў кога не было сумненняў, што нас будуць выдаляць з залы. Таму мы хуценька дамовіліся: будзем супраціўляцца, ухапіўшыся адзін за аднаго, а калі ім удасца разарваць наш ланцуг, пачнем зрываць з іх маскі і чапляцца — колькі будзе сілы — за сталы і крэслы.

Толькі мы паспелі гэта абгаварыць, як у зале запалілася святло і з усіх пяці дзвярэй да нас кінуліся "малпападобныя" — людзі ў чорных, спартыўнага кшталту, касцюмах, адгазніках (для чаго яны ім былі — не разумею па сёння). Пачуліся крыкі... Унурыўшы галаву ў каўнер зімовай курткі, я моцна аберуч ухапіўся за руку Пятра Садоўскага.

Моцна мацюкаючыся і лямантуючы, нападаючыя імкнуліся мяне адарваць ад яго, але я даволі доўга не даваў ім гэтага зрабіць. Бакавым зрокам яшчэ ўбачыў, як Ігар Гермянчук сарваў усё ж такі маску з аднаго "малпападобнага", і той... імгненна адбег убок і кінуўся на падлогу! Тым часам нападаючыя пачалі круціць другую руку Садоўскага, якая была ў яго раней зламаная (нагадваю, што ён меў яшчэ недатыкальнасць і як Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь) — і я мусіў адпусціць яго.

Людзі (калі іх можна назваць людзьмі) у чорным імгненна закруцілі мне рукі за спіну, прычым так, што мой падбародак апынуўся ніжэй каленяў. Мяне пацягнулі паўкругам папярэчнага праходу, што ішоў уздоўж задняга шэрагу дэпутацкіх крэслаў. Каля крэслаў ланцугом стаялі вайскоўцы ў камуфляжы і поўнай амуніцыі, і кожны з іх імкнуўся ботам пацэліць мне ў твар. Шмат каму гэта ўдавалася, з разбітага твару ішла кроў, і — шчыра скажу — у тую хвіліну я ўжо развітаўся з жыццём. "Значыць, — праскочыла думка, — усе тармазы адключаныя, а калі гэтак можна збіваць дэпутата, дык потым павінны забіць, каб нікому не расказаў...".

Прапусціўшы гэтак праз шыхт вайскоўцаў, мяне павалаклі долу па сходах, што вялі да выхаду ў задні двор Дома ўраду. Там стаялі уазікі-"варанкі" з адчыненымі заднімі дзвярыма. Мяне падцягнулі да адных дзвярэй і, нібы бервяно, укінулі ўнутр машыны. Тут жа на падлозе ляжалі штабелем Ігар Гермянчук, Аляксандр Шут, Пётр Садоўскі, Алег Трусаў. Дзверы за мной, апошнім, зачыніліся, і машына памчала з месца.

Каб крыху ачомацца, спатрэбілася хвіліна, але першым апрытомнеў Алег Трусаў. Прыняўшы сяк-так вертыкальнае становішча, ён агледзеўся, што ў машыне, акрамя збітых дэпутатаў, толькі спераду сядзіць кіроўца, а справа яго — нейкі чалавек у форме (што была за форма — у цемры разгледзець было немагчыма). І тут Алег пачаў крычаць, а мы адразу да яго далучыліся хорам: *"Калі не хочаце сесці, вязіце адразу ж у пракуратуру! У Генеральную!"* І, давёзшы нас да скрыжавання праспекта Скарыны і вуліцы Янкі Купалы, кіроўца павярнуў-такі налева, потым яшчэ раз налева — і мы апынуліся каля будынка Пракуратуры Беларусі.

Выскачыўшы з машыны і пакінуўшы там (каб "трымаў машыну"!) Ігара Герменчука, мы кінуліся ў будынак і ў настойлівай форме запатрабавалі ад дзяжурнага па будынку выклікаць тагачаснага Генеральнага пракурора Васіля Шаладонава. Яго знайсці з невядомых нам прычын не ўдалося. Але ўжо праз 7—10 хвілін з'явіўся дзяжурны пракурор, які прыняў ад нас афіцыйную заяву як ад пацярпелых у выніку жорсткага збіцця людзьмі ў вайсковай форме і выклікаў "хуткую дапамогу".

Пасля таго, як мяне крыху перавязалі, я выйшаў на ганак будынка і паклікаў з машыны Ігара Герменчука, якому таксама патрабавалася медыцынская дапамога. Тут было зроблена глупства (зрэшты, апраўдальнае ў стрэсавай сітуацыі): я папрасіў Алеся Шута заняць яго месца ў машыне. Потым высветліцца, што Алеся вывезуць у парк Янкі Купалы і, нанёсшы яму некалькі ўдараў, выкінуць там на зямлю (так, дарэчы, зрабілі з нявольнымі "пасажырамі" іншых трох аўтамашын — толькі вывозілі іх у больш аддаленыя месцы горада).

На здымках: *дэпутаты падчас галадоўкі ля трыбуны Вярхоўнага Савета; дэпутат Аляксандр ШУТ паказвае сляды пабояў.*

Фота Сяргея ГРЫЦА.

У той жа момант мы, хто знаходзіўся ў будынку, атрымалі рэкамендацыю ад супрацоўнікаў "хуткай дапамогі" — адпраўляцца ў клініку так званай "лечкамісіі", каб атрымаць больш кваліфікаваную дапамогу і зафіксаваць там атрыманыя пабоі. Гэта было зроблена цягам наступнай гадзіны, прычым дактары "лечкамісіі" гаварылі нам, што фіксуюць нашыя пабоі, выразна ўсведамляючы сабе магчымыя негатыўныя для сябе наступствы гэтага ўчынку.

Як высветлілася пазней, наша "пяцёрка" дэпутатаў, дамогшыся неадкладнага звароту ў Пракуратуру, крыху сапсавала першапачатковыя планы арганізатараў садысцкай акцыі. Знаёмыя супрацоўнікі тагачаснай аховы Дома ўрада пазней расказвалі некаторым калегам-дэпутатам, нібыта каля 4 гадзін 30 хвілін той самай ночы дзяжурны па Доме ўрада атрымаў званок ад нейкага быццам бы "сведкі", які сказаў, што ў раёне плошчы Незалежнасці адбываецца бойка паміж людзьмі, некаторых з якіх ён раней "бачыў па тэлевізары". Але, калі гэта і праўда, спланаваная правакацыя спрацаваць ужо не магла. Дарэчы, назаўтра нават урадавая "Звязда" надрукавала афіцыйную інфармацыю Пракуратуры Беларусі пра тое, што пяцёра дэпутатаў звярнуліся з заявай пра здзейсненае ў дачыненні да іх злачынства каля 3 гадзін 10 хвілін ночы з 11 на 12 красавіка. Як кажуць беларусы, грэх не схаваеш у мех...

На жаль, падкантрольныя ўладам ужо ў той час СМІ у цэлым не спыніліся перад адкрытай хлуснёй на адрас дэпутатаў-удзельнікаў галадоўкі. Вядома ж, і журналісты, і рэдактары тагачаснай "Советской Белоруссии" ды Беларускага тэлебачання не верылі таму, што пішуць або паказваюць. Не верыў уласным словам, прамоўленым у сваё апраўданне на сесіі, Міхаіл Цесавец (у гэты час запомніўся выкрык аднаго з былых спікераў Вярхоўнага Савета 12-га склікання: *"Правильно! Мало им дали!"*). Але ў кожным з іх перамагла іх савецкасць, дзеянне паводле прынцыпу: "Думай адно, гавары другое, рабі трэцяе".

Мяркую, аднак, што 12 красавіка кансалідаваныя дзеянні тагачаснага Вярхоўнага Савета маглі сітуацыю змяніць. Раніцай яго Прэзідыум заняў досыць радыкальную пазіцыю: было прапанавана наступнае пасяджэнне правесці ў будынку Вярхоўнага Савета і паставіць пытанне аб дачыненні канкрэтных службовых асоб да антызаконных брутальных дзеянняў супраць дэпутатаў. Шчыра скажу, што калі б гэта здзейснілася, асабіста мне не было б надта істотным, ці атрымаюць па заслугах арганізатары і выканаўцы начнога разбою. Куды важнейшым было б тое, што ў гэткай сітуацыі пытанне правядзення рэферэндуму 14 мая аўтаматычна знікала б з парадку дня.

